УДК 81’373

# АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ВАЕННАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

***Я. І. Гусінцоў***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*
*Навуковы кіраўнік:* ***А. М. Шубадзёрава****,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Ваенная лексіка, як сцвярджаюць навукоўцы, паходзіць з лексікі паляўнічага промыслу. Для таго, каб задаволіць свае матэрыяльныя патрэбы і абараніцца ад драпежнікаў, яшчэ ў глыбокай старажытнасці людзі выкарыстоўвалі розную зброю. З цягам часу з узнікненнем у грамадстве антаганістычных элементаў развіваліся і ўдасканальваліся віды зброі, ствараліся вайсковыя фарміраванні, узоры адзення і г. д. Зразумела, што паралельна з узнікненнем і развіццём зброі і ваеннай справы стваралася ваенная лексіка.

Ваенная лексіка — гэта сістэма лексічных сродкаў, якія адлюстроўваюць разнастайныя ваенныя паняцці і ўжываюцца як у штодзённых, так і спецыяльных зносінах.

Ваенная лексіка займае асаблівае месца ў лексічнай сістэме беларускай мовы. З аднаго боку, яе можна аднесці да агульнаўжывальнай лексікі, паколькі гэтая група слоў даступная кожнаму носьбіту мовы і можа быць выкарыстана ў розных умовах зносін, напрыклад: *зброя, камандзір, пісталет, паёк, атака, палон*. З другога боку, ваенная лексіка мае абмежаваную сферу ўжывання. Яе можна аднесці да тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі. У якасці прыкладаў можна прывесці такія вузкаспецыяльныя тэрміны, як «*святловыпраменьванне», «радыёперашкода», «масіраваны агонь»* і інш.

У сувязі з тым, што сфера ваеннай дзейнасці вельмі шырокая і падзяляецца на розныя самастойныя віды, існуе мноства тэрмінаў тактычных, арганізацыйных, ваенна-тэхнічных, тэрмінаў, якія адносяцца да розных родаў войскаў і відаў узброеных сіл і да т. п. Для кожнай з пералічаных абласцей характэрна свая тэрміналогія.

Акрамя фармальных ваенных тэрмінаў, у склад ваеннай лексікі ўваходзяць ваенныя жарганізмы і слэнг вайскоўцаў. Яны ўяўляюць сабой эмацыйна афарбаваныя элементы ваеннай лексікі, у якіх раскрываецца неафіцыйны бок прафесійных ваенных зносін.

Такім чынам, у лексічнай сістэме мовы ваенная тэрміналогія займае значнае месца, бо ваенная дзейнасць застаецца актуальнай ва ўсе часы. Вывучэнне

слоў ваеннай тэматыкі выклікае вялікую цікавасць у сучасных даследчыкаў, бо сфера выкарыстання ваеннай лексікі шырокая.